*У. І. Рынкевіч,*
*прафесар кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат мастацтвазнаўства*

# НАВУКОВЫ ПАДМУРАК ПЛЕНЭРНЫХ ПРАЕКТАЎ

У культурным жыцці Беларусі значную колькасць мастацкіх акцый складаюць пленэры, прысвечаныя дзеячам нацыянальнай культурнай гісторыі: асветнікам, даследчыкам, пісьменнікам, мастакам. Шырыцца інтарэс, які выклікаюць закладзеныя ў іх ідэі адраджэння нацыянальнай культурнай прасторы. Назапашаны вопыт беларускай пленэрыяды цікавіць спецыялістаў з мэтай сістэматызацыі і асэнсавання. Аб'ект нашай увагі – мастацка-публіцыстычныя праекты апошніх гадоў, прысвечаныя беларускім мастакам XIX ст.: «Успамін пра Дабраўляны» (да 200-годдзя з дня нараджэння Казіміра Бахматовіча. Смаргонь, 2008), «Нашчадкі Міхала Падалінскага» (Орша, 2009), «Ян Лапацінскі» (Шаркаўшчына, 2010), «Артур Бартэльс» (Лагойск, 2011). Як аўтар і каардынатар гэтых праектаў адзначу іх адрозненне ад шэрагу падобных пленэраў папярэдніх гадоў па сваёй сутнасці, комплексным змесце. Асновай гэтых праектаў з'яўляецца правядзенне навукова-даследчай работы; праекты комплексныя, кожны з іх уключае некалькі ўзаемазвязаных мастацка-публіцыстычных акцый.

Актуальнасць гэтых праектаў вызначыла само жыццё. Зварот да тэмы беларускай культурнай спадчыны ў галіне выяўленчага мастацтва з'явіўся своечасовым, запатрабаваным і сугучным з зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26 снежня 2010 г. № 1905 Дзяржаўнай праграмай «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады. Аб'яднаўшы мастацкія, асветніцкія і прапагандысцкія сродкі, гэтыя праекты падпарадкаваны ідэі вяртання на Беларусь нематэрыяльнай нацыянальнай культурнай спадчыны, яе захавання і папулярызацыі ў нашай краіне і за яе межамі. Нямала яшчэ прыйдзецца зрабіць даследчыкам, мастакам, публіцыстам, каб народ ведаў сваіх таленавітых землякоў мінулых стагоддзяў і тых, хто пэўны час працаваў у нашым краі і зрабіў значны ўнёсак у развіццё беларускай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ад праекта да праекта выпрацаваўся аптымальны алгарытм іх падрыхтоўкі і ажыццяўлення. Кожны з праектаў складаўся з трох асноўных частак, якія рэалізаваліся паслядоўна. Першы этап уключаў падрыхтоўку дакументацыі па правядзенні мерапрыемстваў і апрацоўку навуковага матэрыялу да кнігі аб жыцці і дзейнасці мастака. Другі – правядзенне рэспубліканскага мастацкага пленэру, выставы эцюднага матэрыялу ў комплексе з іншымі спадарожнымі публіцыстычна-асветнымі мерапрыемствамі на раённым узроўні. Трэці, заключны, этап прадугледжваў выданне кнігі, буклета, правядзенне выніковай мастацкай выставы і перадачу мастацкіх твораў у дар раённым установам культуры і адукацыі.

Вядома, што жыццяздольнасць праектаў закладваецца на этапе іх падрыхтоўкі – у вызначэнні канцэпцыі, задач, структуры мерапрыемстваў, этапаў выканання, сродкаў рэалізацыі, прагназаванні вынікаў. У нашым выпадку падрыхтоўка дакументаў адбывалася ў працэсе перамоў аўтара–каардынатара праекта з кіраўнікамі ўстановы–заснавальніка праекта і арганізацыямі, якія забяспечвалі іх падтрымку. Заснавальнікамі і асноўнымі фундатарамі праектаў ва ўсіх выпадках з’яўляліся раённыя выканаўчыя камітэты. Менавіта яны ў першую чаргу былі зацікаўленыя ў правядзенні прапанаваных праектаў, бо кіраўнікі раёнаў адчуваюць рэальную патрэбу ў развіцці культурнага, ідэалагічна-выхаваўчага кірунку на мясцовым нацыянальна-гістарычным матэрыяле. На самадзейным узроўні такі навукова-мастацкі пласт не падняць. Патрэбны кваліфікаваныя навуковыя работнікі і высокапрафесійныя мастакі, якіх у раённых цэнтрах няма. Таму кіраўніцтва райвыканкамаў заўсёды вітала ініцыятыву правядзення праектаў і пры ўсіх аб’ектыўных эканамічных праблемах мясцовых бюджэтаў знаходзіла магчымасці іх ажыццяўлення.

Значная роля ў рэалізацыі планаваных мерапрыемстваў адводзілася дзяржаўным установам і грамадскім аб’яднанням, якія падтрымлівалі праекты. У першую чаргу адзначым грамадскае аб’яднанне «Беларускі саюз мастакоў», адным з асноўных кірункаў дзейнасці якога з’яўляецца папулярызацыя нацыянальнага мастацтва. У гэтай сувязі кіраўніцтва творчага саюза ўдзельнічае ў фарміраванні складу мастакоў-пленэрыстаў, прадстаўляе экспазіцыйную плошчу сталічнага Палаца мастацтва і забяспечвае рэкламу ў правядзенні заключнай выставы праектаў. Так, на самай вялікай выставачнай мастацкай пляцоўцы краіны мерапрыемствы раённага маштабу набываюць размах рэспубліканскіх акцый:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адбываецца акт вяртання ў сучасную культурна-інфармацыйную прастору імёнаў беларускіх мастакоў. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў таксама традыцыйна аказвае падтрымку праектам, забяспечваючы навуковае рэцэнзаванне матэрыялаў і рэдактарска-выдавецкую работу па выданні кнігі і буклета аб праекце, які фіксуе гэтую падзею ў гісторыі. Цэнтральнае тэлебачанне, штотыднёвік «Культура» і мясцовая раённая прэса таксама ўдзельнічаюць у правядзенні інфармацыйнай кампаніі як складніка медыяпіара нацыянальнай культурнай прасторы.

Заўважым, што ўзгаданыя вышэй прозвішчы мастакоў XIX ст. да ажыццяўлення праектаў былі вядомы толькі вузкаму колу даследчыкаў гісторыі мастацтва. Ні мастакі–удзельнікі праектаў, ні раённыя ўлады, мясцовыя дзеячы культуры і адукацыі аб іх практычна амаль нічога не ведалі. Імёны нашых некалі знакамітых землякоў трэба было нанова вяртаць на айчынную культурную глебу. Таму можна зразумець тую душэўную ўсхваляванасць, якая ахапіла людзей. Напрыклад, нечаканым для наведвальнікоў выставы ў Оршы было даведацца аб тым, што менавіта іх зямляк Міхал Падалінскі быў піянерам беларускай «вучонай» (прафесійнай) графікі. Або з якім здзіўленнем жыхары вёскі Дабраўляны, што на Смаргоншчыне, на выставе ля рэшткаў маёнтка графа Гюнтэра слухалі аб тым, што менавіта тут нарадзіўся, працаваў і завяршыў свой зямны шлях мастак Казімір Бахматовіч – адзін з першых беларускіх літографаў, рысавальшчык-мініяцюрыст. Паглядзець мастацкія выставы, якія ладзіліся ў раённых цэнтрах, і паслухаць аб знакамітых земляках прыходзіла шмат народу. Асобныя людзі з колу шаркаўшчынскай інтэлігенцыі ўжо ведалі аб мясцовых магнатах роду Лапацінскіх, але тое, што староста мсціслаўскі Ян Нікодэм Лапацінскі быў заўзятым калекцыянерам мастацтва і сам займаўся гравіраваннем па медзі, было нечаканым нават для самых прасунутых мясцовых краязнаўцаў.

Вядома, што паспяховасць выніку любой акцыі забяспечвае склад выканаўцаў. У нашым выпадку гэта былі мастакі і мастацтвазнаўцы, апантаныя ідэяй адраджэння нацыянальнай культурнай гісторыі, якія неабыякава ставяцца да лёсу айчыннага мастацтва. Ад кожнага з іх патрабавалася праяўленне не толькі сталага прафесіяналізму, але і высокіх маральных і грамадзянскіх якасцей. Загадзя адно-два месца ў складзе пленэрных груп рэзерваваліся для творчай моладзі – студэнтаў старшых курсаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкіх ВНУ рэспублікі. У такіх «творчых акадэміях» моладзь набывае прафесійны вопыт работы, вучыцца мысліць маштабна, падзяржаўнаму, і разам з тым на справе рэалізуецца прынцып пераемнасці пакаленняў мастакоў.

У раённых гарадах і пасёлках, дзе праходзілі пленэры, у пэўнай ступені вырашалася задача культурна-асветнага забеспячэння патрэб насельніцтва. Вядомыя беларускія мастакі са сваімі творамі галоўным чынам працавалі на эцюдах, але таксама знаходзілі час сустрэцца з мясцовымі работнікамі культуры і адукацыі, пагутарыць з дзецьмі ці правесці майстар-класы ў мастацкіх школах. Усё гэта садзейнічала вызначэнню арыенціраў развіцця прафесійнай і непрафесійнай мастацкай творчасці сярод мясцовай моладзі. Нярэдка разам з асноўнай групай удзельнікаў пленэру працавала спантанна арганізаваная «група падтрымкі», якая складалася з мясцовых аматараў выяўленчай творчасці і студэнтаў навучальных устаноў мастацкіх спецыяльнасцей.

Перадачу мастакамі–удзельнікамі пленэру твораў мастацтва ў дар мясцовым установам культуры можна разглядаць як аснову для стварэння або папаўнення ўжо існуючых фондаў мастацкіх галерэй у рэгіёнах. Гэта акцыя з’яўляецца канкрэтным крокам на шляху пераадолення дыспрапорцыі магчымасцей знаёмства са здабыткамі нацыянальнай культуры гарадскога і сельскага насельніцтва. Рэалізацыя праектаў забяспечвае максімальную даступнасць каштоўнасцей сучаснага выяўленчага мастацтва і аб’ектаў мастацкай спадчыны для насельніцтва аддаленых рэгіёнаў.

Своеасаблівасць праектаў у тым, што ім заўсёды папярэднічала вялікая даследчая мастацтвазнаўчая праца. Без навуковага падмурку праекты з самымі высакароднымі задумамі застануцца на ўзроўні проста пісання эцюдаў, якія фіксуюць стан прыроды з элементамі рэшткаў старажытнай архітэктуры. Вывучэнне літаратурных крыніц, збіранне эмпірычнага матэрыялу ў музейных фондах Польшчы, Літвы, Расіі, яго апрабацыя на навуковых канферэнцыях і ў артыкулах перыядычнага друку заняла ў аўтара праектаў больш чым дзесяць гадоў. Праведзенае навуковае даследаванне зараз матэрыялізуецца ў артыкулах рэспубліканскіх часопісаў і асобных навуковых выданнях, якія выдаюцца невялікім тыражом. У дадатках гэтых выданняў, прысвечаных творчасці мастакоў, як правіла ўключаны гістарычны матэрыял мясцовых краязнаўцаў, даследчыкаў. Напрыклад, у кнізе «Ян Лапацінскі» змешчаны матэрыял аб родзе Лапацінскіх герба «Любіч»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Ляскоўскага з Шаркаўшчыны, а ў дадатку кнігі «Артур Бартэльс» – матэрыял С. Гамеза аб унікальным лагойскім навукова-культурным феномене – музеі старажытных каштоўнасцей К. і Я. Тышкевічаў. Пэўную дапамогу ў набыцці якаснага ілюстрацыйнага матэрыялу па дамоўленасці з культурна-адукацыйнымі ўстановамі мы атрымліваем з Польшчы. Пасля распаўсюджання гэтых выданняў сярод рэспубліканскіх бібліятэк і спецыяльных адукацыйных установ мастацкага профілю пачынаецца другое жыццё спадчыны мастакоў: далейшае вывучэнне, выкарыстанне матэрыялаў у навуковай і культурна-адукацыйнай сферах.

Вяртанне на Беларусь спадчыны ў выглядзе алічбованых здымкаў мастацкіх твораў і дакументальных матэрыялаў, таксама як і выданне ілюстраваных кніг, стварэнне сацыяльна значных карцін, гравюр гістарычнага зместу для музейных экспазіцый – справа, якая патрабуе дзяржаўнага падыходу. Грунтоўная падтрымка дзяржавы намаганняў энтузіястаў па стварэнні дасканалай навукова-даследчай, творчай і матэрыяльна-тэхнічнай базы магла б забяспечыць дасягненне паўнавартасных вынікаў праектаў.

На сённяшні дзень у працэсе ажыццяўлення знаходзіцца праект, прысвечаны 180-годдзю з дня нараджэння мастака Альфрэда Ромера. На стадыі распрацоўкі яшчэ некалькі новых праектаў, прысвечаных мастакам, чые імёны чакаюць свайго часу ўваскрашэння ў сучаснай культурнай прасторы Беларусі. Праекты перш за ўсё важныя як рэальная дзейнасць па ўмацаванні нацыянальнай самасвядомасці для саміх беларусаў, але разам з тым гэтыя мастацка-публіцыстычныя акцыі могуць стаць сродкам пазіцыянавання стаўлення нашай краіны да сваёй культурнай спадчыны ў маштабе сусветнай культурнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ